В Париже первый раз мы побывали только в 2015 году: денег особо на поездки не было, как-никак двое студентов в семье. Изредка дети приезжают домой в Беларусь. Конечно, стараюсь их вкусненько накормить. Счастлива, если удается всем вместе отправиться на Браславские озера на рыбалку: ведь и я, и муж, и Ваня – все мы любим рыбачить! Разговоров о музыке тоже много. Но ни у сына, ни у дочки не звучат слова «сделать карьеру». Считаю, это повод для гордости.

Иван КАРИЗНА: «Мне нравится играть в Беларуси»

«Я жил бы здесь, если бы только из Минска дешевле было летать на концерты в другие страны. Например, мне для виолончели всегда нужно покупать второе место в самолете, а билеты в 3–5 раз дороже, чем в Европе…

Мечтаю о том, чтобы у нас в Беларуси появился большой концертный зал, а лучше – современный комплекс с хорошей акустикой. Я хотел бы иметь ансамбль солистов, маленький оркестр, какой в свое время собрал Спиваков. Он создал свой камерный оркестр «Виртуозы Москвы», который сейчас считается одним из лучших в мире. Так же сделал Юрий Башмет, великий альтист. Создать такой оркестр в Беларуси реально, многие белорусские музыканты с мировым именем вернулись бы в Минск, если бы им были предложены более-менее хорошие условия».

«Очень хочется, чтобы в моей стране у людей было больше возможностей слушать хорошую музыку. Поэтому в прошлом году наш с Кириллом Кедуком европейский гастрольный тур плавно перешел в тур по Беларуси. Мы выступили в 27 городках – это не шутка! Есть такая тенденция, что большинство значимых культурных событий проходит в Минске, а в регионах люди просто не имеют возможности услышать классическую музыку живьем. Нам очень хотелось дать этим людям альтернативу. Также, возможно, дать повод для коллег-музыкантов задуматься над тем, как важна популяризация классической музыки в регионах – там, где находятся истоки нашей белорусской культуры.

Мы были приятно удивлены тем, как люди нас слушали и принимали, – практически в каждом городе нас провожали овациями стоя. Это абсолютно расходится с мнением, что у нас в Беларуси классическая музыка малоинтересна. Белорусская публика отличается искренностью и почти детской непосредственностью».

«Классическая музыка в частности и искусство в целом развивают в человеке творческий потенциал. Поп-музыка разве развивает? Думаю, нет. Она не развивает, а развлекает публику. Искусство же заставляет человека задуматься о важном, попытаться понять, кто он и чего хочет от жизни. И, кстати, я недавно читал, что, согласно статистике, в колониях для малолетних преступников нет детей, окончивших музыкальные школы. Может, не стоит сокращать финансирование культуры, может, лучше государству содержать музыкальные школы, чем исправительные учреждения?..»

Иван Каризна – один из наиболее успешных и востребованных виолончелистов молодого поколения. В качестве солиста постоянно выступает на различных сценах Франции, Германии, Италии, Бельгии, Мексики, Нидерландов, России, США, Японии, Чили и других стран. Выпускник Республиканского музыкального колледжа при БГАМ (класс заслуженного артиста Республики Беларусь Владимира Перлина) и Парижской Высшей консерватории музыки и танца (класс профессора Жерома Перно). В настоящее время является магистрантом престижной Академии Кронберг в Германии. Выступает в лучших залах мира, среди которых в Concertgebouw в Амстердаме, Salle Pleyel и Cite de la Musique в Париже, Concerthaus в Берлине, Benaroya Hall в Сиэттле. Сотрудничает с выдающимися дирижерами: Владимиром Спиваковым, Валерием Гергиевым, Ионом Марином, Жоржем Пеливаньяном. Лауреат более 10 авторитетных международных конкурсов, в том числе Международного конкурса им.П.И.Чайковского в Москве (2011) и Конкурса имени королевы Елизаветы в Брюсселе (2017), где он также стал обладателем «Приза публики». Кроме того, в 2017 году Иван Каризна был награжден Орденом Рыцаря Тастеван (Франция) за вклад в развитие музыкальной культуры во Франции.

Елена ТЕРЕНТЬЕВА.

(«Алеся».)

ЯКІМ БЫЎ ДЛЯ ВАС 2017 ГОД?

Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы»



І здарыўся цуд…

Год больш чым паспяховы: мы атрымалі дакумент, які чакалі і які нават перасягнуў нашы чаканні. Гэта ўказ прэзідэнта «Аб развіцці агратурызму». Трохі гісторыі. З 2006 года галіна сельскага турызму працавала паводле ўказа №372. Працавалі выдатна: у краіне адкрылася амаль 2300 сядзіб. Але ў мінулым годзе ў дзяржавы з'явіліся намеры перавесці нас у статус ІП, а гэта забіла б нашу галіну! Мы пачалі змагацца. І гаспадары сядзіб, і я сустракаліся з чыноўнікамі рознага ўзроўню, аж да Кабякова дайшлі, і спрабавалі пачуць адзін аднаго. І здарыўся цуд: усё атрымалася! Агратурызм увайшоў у абойму апошніх дакументаў пра прадпрымальніцтва. Новы ўказ «Аб развіцці агратурызму» даў яшчэ больш свабод і магчымасцяў нашай галіне. Гэтая сфера сёння, як ніколі, адкрыта для рэалізацыі самых смелых ініцыятыў. Нам цяпер можна ўсё праводзіць: і вяселлі, і святы, і трымаць гасцявыя дамы. Дадзена зялёнае святло ініцыятыве: укладайце свае грошы, развівайце інфраструктуру, стварайце крэатыўны прадукт. На гэта пайшоў год майго жыцця. Я задаволена яго вынікамі.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ



Выйшаў «Верасень»

Выйшаў з друку чарговы, сямнаццаты па ліку, нумар літаратурна-мастацкага часопіса "Верасень".

Паэзія ў часопісе прадстаўлена вершамі **Лізаветы Дзеручэнка, Насці Падрабінкінай, Алены Быкавай, Крысціны Башарымавай, Кацярыны Массэ, Крысціны Баранавай, Надзеі Філон, Таццяны Крэнь, Людмілы Шчэрбы, Святланы Куль, Тамары Аўсяннікавай, Васіля Зуёнка.**

Раздзел "Проза" складаюць апавяданні **Сяргея Белаяра, Валянціны Пісарчык, Анатоля Бароўскага.**

У раздзеле "Пераклады" друкуюцца вершы **Сібілы Алерама,** перакладзеныя з італьянскай мовы **Аксанай Данільчык**.

Раздзел "Крытыка" адкрывае «вясёлкавае» эсэ Васіля Дранько-Майсюка, прысвечанае Марку Шагалу. Аб сваім «шляху да Беларусі» распавядае ў гутарцы з **Эдуардам Акуліным** старшыня культурніцкага фонду «Вяртанне» **Павел Падкарытаў.** Працягваюць друкавацца запісы «з памятнай кніжкі» **Леаніда Дранько-Майсюка.** Сакрэтамі музычнай творчасці ў гутарцы з **Аленай Масцеравай** дзеліцца гурт **«Haina».** «Дыярыуш беларускага падарожніка» прапануе чытачам часопіса **Юры Кур'яновіч.** Творчы ціск маладой беларускай літаратуры замярае ў сваім аналітычным артыкуле літаратуразнаўца **Эдуард Дубянецкі.** З чарговай рэцэнзіяй на новы раман **Людмілы Шчэрба** «Урб@н.М: Адзін дзень майго жыцця» выступае крытык **Анатоль Трафімчык.**

Вокладка нумара – **Дар'я Бунеева**. Мастацкае афармленне – **Валерыя Праслава**. Ілюстрацыі – **Ігар Свянціцкі**.

Пытайцеся пра "Верасень" №17 на сядзібе ТБМ (Румянцава,13). Чытайце "Верасень" на сайтах: **Kamunikat.org** і **tbm-mova.by**. Дасылайце свае творы ў "Верасень" на адрас: **verasenchas@gmail.com.**

Эдуард АКУЛІН.

ДАВЕДАЧНАЕ БЮРО

На пытанні чытачоў адказвае старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі ГА "Беларускае таварыства абароны правоў спажыўцоў" Васіль ВАЛАСЮК.

Вярнуць пральную машыну

Набылі ў растэрміноўку пральную машыну. Але пры першым мыцці выявіўся недахоп – цячэ вада на падлогу. Хацелі вярнуць машыну, але нам было адмоўлена. Супрацоўнікі магазіна прапанавалі выклікаць майстра, які ацэніць ступень недахопу. І, калі машыну можна парамантаваць, то так і зробяць. Ці можам мы вярнуць машыну ў любым выпадку?

Дзмітрый ПАПКОЎ, г.Рагачоў.

– Можаце. Пішыце пісьмовую адмову ад рамонту і патрабуйце замены тавару альбо вяртання грошай.

Тэлефон «не бачыць» SIM-карту

Ці можна вярнуць мабільны тэлефон, калі ён не працуе з маёй SIM-картай, а з іншымі працуе? Ці з'яўляецца такі тавар няякасным?

Вікторыя ПАЎЛАВА, г.Ушачы.

– Не з'яўляецца. Справа тут не ў тэлефоне, а таму звярніцеся ў любы салон мабільнай сувязі, дзе вам заменяць SIM-карту.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 СНЕЖНЯ 2017 г.

ПЕРСОНА

«…И тогда я поняла: легко не будет»

Звезда оперной сцены Оксана Волкова о преодолении и творчестве



Только что закончился IV Минский международный Рождественский конкурс вокалистов. И как закончился! Непредсказуемыми результатами, которые ввели в настоящий дискуссионный штопор некоторую часть публики. Что, впрочем, говорит лишь о том, что в Минске есть настоящие меломаны и что минчане страстно интересуются оперной музыкой.

Так как в жюри Рождественского конкурса в этом году работала прима Большого театра **Оксана ВОЛКОВА**, *мы не преминули воспользоваться этим поводом, чтобы поговорить о мероприятии, всколыхнувшем нашу тихую заводь. А также задать знаменитой певице несколько личных вопросов. Но сначала все-таки о насущном, о конкурсе.*

– Быть членом жюри на конкурсе – это ведь довольно утомительная работа: прослушать в первом туре более двух сотен певцов.

– Но мне нравится, мне интересно слушать, анализировать. Все равно придет время, оно наступает у каждого певца, когда будешь пробовать себя в педагогике, Так что работа в жюри – хороший опыт. Правда, в этом году результаты конкурса были для меня неожиданными, у меня были другие фавориты, но…

– А как, собственно, работало жюри? Разве вы не вместе вырабатываете ваши решения?

– Наша система такова, что мы, члены жюри, друг с другом конкурсантов не обсуждаем. На первых двух турах мы ставим только "да" или "нет", причем не зная, как голосует рядом сидящий коллега. Компьютер результаты обрабатывает и мгновенно выдает результат. На третьем туре нам раздают бюллетени, и против фамилий конкурсантов мы расставляем цифры – кто, по нашему мнению, на третьем месте, кто на втором, кто на первом (в порядке убывания). Обсуждения никакого нет, не принято! В этом году первая премия от второй оторвалась только на один балл. Жаль. Казалось бы, это так незначительно, можно обсудить, поговорить, но – нет, правила не позволяют. Счет только по баллам. Потому что вкусы у всех разные, в жюри сидели люди из разных стран, и к единому мнению можно было не прийти и за неделю. И вообще, я скажу так: да, искусство – не спорт, но конкурс – это борьба, сравнение. Певцов сравнивают друг с другом.

– Зато как всех порадовал королевский жест господина Гридюшко: прямо на оглашении результатов конкурса он пригласил белоруску Марию Галкину (второе место) в труппу Большого театра.


– Я считаю, это очень дальновидный шаг нашего генерального директора, потому что такие голоса, как у Марии Галкиной, – сопрано лирико-спинто – встречаются достаточно редко. Мария только закончила Санкт-Петербургскую консерваторию, никогда еще не работала в театре, но решение Владимира Павловича по-настоящему стратегическое, оно на будущее. Вообще, наш Минский международный конкурс – это конкурс для зрелых певцов. Но иногда случается, что певец прекрасно показывает себя в классе, а вышел в зал – и голос потерялся.

– Тем более что в нашем зале есть буквально провальные места, где солистов плохо слышно.

– По моим наблюдениям, большое значение для певца имеет декорация на сцене. Если декорация жесткая (то есть сцена заполнена, закрыты "карманы"), вопросов нет – полетность голоса увеличивается, артиста попросту лучше слышно. Но конкурс сложен именно тем, что сцена – открытая, декораций на конкурсе нет. А голос должен быть собранным. Условия непростые! Поэтому побеждают певцы с опытом.

– Теперь, если позволите, о вашем творчестве. Вы по-прежнему много гастролируете по миру. Интересно, кто за последнее время стал, например, вашим дирижером-открытием?

– У меня была потрясающая встреча с маэстро Даниэлем Ораном, главным дирижером Израильской оперы на постановке "Сила судьбы" Джузеппе Верди. Это могучая личность! Репетиционный процесс вел поначалу его помощник, но все шептались: "Вот когда приедет Оран, то все и начнется по-настоящему!" И действительно, он сумел зарядить буквально всех своей харизмой. Я сначала была приглашена во второй состав исполнителей, но в результате нашей с ним работы маэстро перевел меня в первый состав. Правда, перед этим он поставил меня в нелегкие условия. В оригинале у Верди в некоторых местах певцу дается своего рода "люфт": петь с выходом наверх или петь с выходом вниз. Два варианта. Я выбрала тот, где можно идти вниз – зачем, думаю, напрягаться? И заучила его. Потому что если вверх, то это четыре си второй октавы. Сижу на репетиции и вдруг слышу, что мою коллегу маэстро просит исполнять именно первый вариант! И я поняла, что здесь мне легко не будет. Да еще когда услышала его темпы… А пассажи при этом очень тяжелые… Думаю: конец! Но собралась, позанималась. Поставила цель и – преодолела трудности! Или вот мне, меццо-сопрано, например, предложили партию Джульетты в "Сказках Гофмана" в Метрополитен-опера.



– Я счастлива, что слышала вас в этой роли в конце сентября в Нью-Йорке!

– Но это сопрановая роль! Хотя, конечно, я согласилась сразу: раз такие высокие профессионалы из Мет считают, что я могу это спеть… Стала заниматься, и вижу – колоссально высоко, все в горле аж задирается и хрипит. Тем более мелодические фразы там в секвенции – все выше и выше. Но стала заниматься, все лето работала. И к сентябрю голос подчинился!

– Удивительный аппарат – человеческий голос.

– При рациональном, умном подходе в себе можно развить многое. Пение как спорт: если мышцу долго тренируешь (а голосовые связки – это мышца), то она начинает "отвечать". По крайней мере в моем случае это так. У меня действительно низкий голос, мне сложно держать высокую тесситуру, но, когда ты нарабатываешь ее изо дня в день, голос поддается. Словно говорит: "Не хочу, но – ладно, так и быть!"

– А вот у меня вопрос, что называется из зрительного зала. Когда вы приезжаете в чужой театр на один спектакль, вводитесь в него как гастролер, как обстоит дело с костюмами? Их по вашим меркам шьют вам специально?

– Нет, костюмы на приезжую певицу не шьют, я должна влезть в то, что есть. Ушить, конечно, проблемы нет, а вот расшить… В общем, тоже проблемы нет, настоящие специалисты со всем справляются. Но если я приезжаю на новую постановку, на месяц-другой с репетициями (как, например, в Нью-Йорк), то костюм, конечно, шьют специально на меня, и тогда я обычно говорю костюмерам: "Вы сейчас на меня не смотрите, к спектаклю я похудею". И правда – худею. Потому что когда живу одна, без семьи, то не готовлю, не пробую, а в холодильнике у меня лежит лишь лимон, имбирь и кофе. Все.

– Голодом себя морите?

– Днем, конечно, обедаю, а вечером – ни-ни. Хочется, но зайдешь на кухню, посмотришь на этот лимон… И сделаешь имбирный чай, а потом быстрее спать. И, как правило, к премьере я на размер меньше.

– Жестко!

– Но это при условии, что ко мне никто не приезжает. Однако с каждым годом друзей становится все больше, и это прекрасно. И где мы встречаемся по вечерам? Конечно в ресторане. Тем более если приезжает моя семья, дети. Тут уж вкусняшкам нет конца.

– Ну, вы все-таки занимаетесь не модельным бизнесом…

– Но Кармен должна соответствовать своему литературному прототипу и по возрасту, и по весу.

– Опера такое таинственное искусство… Возможно, потому и популярно 500 лет подряд. Вот Монтсеррат Кабалье на пике мировой славы не была ни молодой, ни худой, а пела так, что все верили: она и есть красавица Турандот, она и есть обольстительная Виолетта…

– Магия великого голоса, музыки, света…

– А сейчас опера очень коммерциализируется. Мне кажется, даже что-то теряет от того, что к певцам предъявлются стандарты внешности, как к моделям.

– Но согласитесь все-таки, что хорошие внешние данные – это преимущество. Сегодняшний день диктует опере новые правила. Да и скорости жизни сегодня другие: конкурентность выросла раз в сто, приходится бороться за публику. Очень сложно заставить людей идти в оперу, если на сцене три стула, занавеска и статичная певица, пусть и выдающаяся. На первых несколько спектаклей еще сходят меломаны. Но дальше?.. А коммерческий успех очень важен оперному театру. Мы работаем для зрителя.

– Для массового зрителя, увы. Впрочем, великий Хворостовский тоже пел на площадях популярный репертуар. Вы не раз выходили вместе с ним на сцены самых знаменитых театров мира. А когда познакомились?

– Впервые в Нью-Йорке на постановке оперы "Риголетто" в Метрополитен. На репетициях во время спевок, помню, всегда сидели вместе. Я очень внимательно слушала, как Дмитрий поет, как строит фразу, каким великолепным тембром это делает. Он был Мастер с большой буквы! Рядом всегда присутствовала его жена Флоша. Она так трогательно волновалась за него. А во время перерывов мы все вместе ходили в буфет, и он часто покупал мне булочку: "Съешь!" Ему было жаль, что я себя строго ограничиваю, и он подшучивал. Вообще, Дмитрий был очень компанейским, открытым человеком. Я была у него дома в Лондоне – в то время мы вместе выступали в Ковент Гардене в "Евгении Онегине". Флоша тепло принимала гостей. Очень уютный дом, очень воспитанные дети. Что еще сказать? Я сейчас очень много слушаю Дмитрия Хворостовского, мой «Фэйсбук» просто забит его записями. Его уход – это трагедия, которая тронула буквально весь мир. Мы вместе работали в Нью-Йорке как раз в тот драматический период, когда Дмитрий уже знал о своей болезни и принимал химиотерапию. Он так мужественно держался… Когда выходил на сцену, то отрабатывал не на сто, а на все триста процентов. На триста! Вообще, когда люди театра узнали о болезни певца, к нему поднялась настоящая волна любви. Каждый пытался подойти и выразить поддержку: "Димочка, борись!" Я была уверена, что произойдет чудо, что он выздоровеет. Всеобщая энергия любви должна была помочь! Но…

– Такие артисты, как он, рождаются, наверное, раз в век... Но вернемся к живым. Расскажите, какие у вас творческие планы?

– Сезон опять напряженный, я второй год без отпуска. Впереди Зальцбургский фестиваль: два летних месяца буду петь "Пиковую даму" под управлением маэстро Мариса Янсонса. До этого "Сельская честь" в Женеве, а еще раньше – "Евгений Онегин" в Гамбурге. Плюс "Кармен" в Риге, Таллинне.

– Как реагирует театр на постоянные зарубежные гастроли своей примы?

– С пониманием. Впрочем, если я в Минске, я тоже стараюсь для родного театра сделать все, что могу, несмотря на болезнь или усталость. Встаю и работаю, чтобы отблагодарить родной Большой. Я позволяю себе отказаться от спектакля лишь только в том случае, когда есть серьезные нарушения с голосом. А вообще, знаете, как мы шутим? Певец здоров и готов петь… только один раз в году! Когда он в отпуске и когда петь ни для кого не нужно. Да, у нас большие нагрузки, спектакли идут один за одним, не успеваешь порой восстановиться. Но что делать? Настоящая работа – она на преодоление. Возможно, это главное удовольствие, которое приносит нам творчество.

Елена МОЛОЧКО.

ДЛЯ ВЯСЁЛАЙ КАМПАНІІ

Ехалі казакі

Словы і музыка народныя.

Ехалі казакі
Ды з Дону дадому,
Падманулі Галю,
Забралі з сабою.

Ой, ты, Галя,
Галя маладая!..
Падманулі Галю,
Забралі з сабою. } 2 разы

Ты паедзеш з намі,
З намі, казакамі.
Табе будзе лепей,
Як у тваёй мамы.

Ой, ты, Галя,
Галя маладая!..
Табе будзе лепей,
Як у тваёй мамы. } 2 разы

І павезлі Галю
Цёмнымі лясамі.
Прывязалі Галю
Да сасны касамі.

Ой, ты, Галя,
Галя маладая!..
Прывязалі Галю
Да сасны касамі. } 2 разы

Падпалілі сосну
Ад нізу да верху.
Сасна дагарае,
Галя вымаўляе.

Ой, ты, Галя,
Галя маладая!..
Сасна дагарае,
Галя вымаўляе. } 2 разы

– А хто мяне чуе,
Няхай паратуе!
А хто дочак мае,
Няхай навучае!

Ой, ты, Галя,
Галя маладая!...
А хто дочак мае,
Няхай навучае! } 2 разы

ЯКІМ ДЛЯ ВАС БЫЎ 2017 ГОД?

Віталь ГУРКОЎ, 12-разовы чэмпіён свету па муай-тай і вакаліст гурта "Brutto"

У мяне ўсё проста файна!

-- Калі казаць пра спартыўны бок майго жыцця, то ў 2017 годзе хацеў бы адзначыць адну значную для сябе падзею – у ліпені я стаў пераможцам турніру па муай-тай на Сусветных гульнях-2017, якія праходзілі ў Польшчы.

Таксама незабыўным быў і канцэрт "Brutto" на "Мінск-Арэне". Я памятаю тую атмасферу, што была ў зале, тую энергетыку, якой было напоўнена ўсё наша выступленне. Адным словам, такое не забываецца ніколі! Тым больш што ў Беларусі мы ўпершыню выступалі перад такім масавым слухачом.

А што тычыцца асабістага жыцця, то тут таксама ўсё проста файна…

РЭГІСТРАТУРА

На дапамогу анкахворым прыйдуць псіхолагі

У Беларусі з'явяцца прафесійныя псіхолагі для работы з анкалагічнымі хворымі. РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава атрымаў ліцэнзію на аказанне адукацыйных паслуг, што дазволіць установе рыхтаваць адпаведных спецыялістаў. Навукова-практычны цэнтр супрацоўнічае з сацыяльна-асветніцкай установай "Цэнтр падтрымкі анкапацыентаў "У імя жыцця". Дырэктар цэнтра ***Ірына Жыхар****, якая сама перамагла анкалагічнае захворванне, распавядае:*

– Пры дапамозе спецыялістаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі мы пачалі дзейнічаць у накірунку таго, каб чалавек, якога выпісваюць з анкадыспансера, не адчуваў сябе кінутым і адзінокім. Калі ў вялікіх гарадах – Мінску і абласных цэнтрах – гэта праблема стаіць не так востра, то ў маленькіх і аддаленых пасёлках і вёсачках чалавек застаецца сам-насам са сваёй бядой. Сумесна са спецыялістамі з РНПЦ анкалогіі мы думалі над тым, каб на базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва маглі працаваць псіхолагі, гатовыя дапамагаць менавіта хворым на анкалогію.

У 2011 годзе на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі быў набраны першы курс, на якім навучаліся 16 спецыялістаў. 12 з іх прадстаўлялі рэгіёны Беларусі. Але, сутыкнуўшыся з анкалагічнымі хворымі, большасць з выпускнікоў сказалі: мы не гатовы працаваць з гэтымі людзьмі. І гэта не азначае, што яны дрэнныя спецыялісты. Проста людзі аказаліся негатовыя дапамагаць менавіта гэтай групе пацыентаў. На сённяшні дзень з тых 16 працуюць толькі двое.

У нашай краіне ў адрозненне ад суседняй Літвы пакуль няма спецыяльнай асацыяцыі, якая аб'ядноўвала б анкапсіхолагаў. І тады мы паспрабавалі вырашыць праблему іншым шляхам: псіхолагі, якія будуць працаваць з хворымі на рак людзьмі, абавязкова павінны кантактаваць з урачамі-анколагамі, а таксама з прафесійнымі ўрачамі-псіхіятрамі і псіхатэрапеўтамі. У РНПЦ анкалогіі ёсць псіхалагічная служба, якая гатова рыхтаваць псіхолагаў менавіта для работы з анкахворымі.

Кіраўнік псіхалагічнай службы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі – урач-псіхатэрапеўт ***Екацярына Авяркова*** *адзначыла:*

– У мінулым годзе наш цэнтр атрымаў ліцэнзію на адукацыйную дзейнасць. Мы адкрыем курс, пасля заканчэння якога ўрачы-псіхатэрапеўты, урачы-псіхіятры атрымаюць веды і практычныя навыкі работы з анкалагічна хворымі людзьмі. Гэты курс будзе добраахвотным. А далей, як я гэта бачу, хацелася б, каб такія спецыялісты працавалі на ўсіх узроўнях. Што я маю на ўвазе? У краіне існуе сістэма медыцынскіх устаноў: рэспубліканскага ўзроўню – дыспансеры, раённыя бальніцы і паліклінікі. Мы хочам, каб урачы-псіхіятры, псіхатэрапеўты, якія працуюць на сваім узроўні, навучыліся ў нас. Бо зараз мы сутыкаемся вось з чым: пацыент звяртаецца ў РНПЦ, мы як можам яму дапамагаем, а далей чалавек, прыязджаючы да сябе ў вёску, проста не ведае, куды звярнуцца. Мы хочам дабіцца, каб пацыент, выходзячы са сцен нашай установы, дакладна ведаў, куды яму звяртацца далей. У анкахворага павінна быць пастаяннае сацыяльнае суправаджэнне. Над гэтым мы зараз і працуем, мяркуючы, што курсы, якія будуць праводзіцца на базе РНПЦ, дапамогуць вырашыць гэтую праблему.

P.S. 23–24 студзеня наступнага года ў Мінску пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Павышэнне якасці жыцця анкапацыентаў праз развіццё супрацоўніцтва дзяржаўных камерцыйных і некамерцыйных арганізацый". У ёй возьмуць удзел спецыялісты з Даніі, Літвы, Польшчы і Беларусі. Між іншым, у многіх еўрапейскіх краінах ёсць досвед супрацоўніцтва ўрачоў і псіхолагаў, якія вядуць хворага на анкалогію пацыента. Таму замежны вопыт для беларускіх медыкаў і псіхолагаў можа быць вельмі карысным.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Хакеістаў адправілі… на фронт

Учора маладзёжная (да 20 гадоў) хакейная зборная стартавала на чэмпіянаце свету ў ЗША.

Адпраўлялі хакеістаў на турнір досыць незвычайна. Відаць, чыноўнікі вырашылі надаць спартсменам дадатковы патрыятычны зарад, бо рыторыка гучала досыць спецыфічная – у ваенным стылі.

“Хутка вы адправіцеся абараняць гонар нашай Радзімы, – казаў “на дарожку” старшыня Беларускай федэрацыі хакея **Сямён Шапіра**. – *А што такое Радзіма? У першую чаргу – гэта тата і мама, брат, сястра, гэта сябры і суседзі, гэта наш дзесяцімільённы народ, гэта наша зямля, якая прасякнута крывёй бацькоў і дзядоў… У гісторыі нашай краіны было шмат войнаў. На шчасце, сёння мы жывём у мірны час. Аднак зусім хутка нас чакае хакейная бітва…”*



Не абышлося падчас праводзін і без **Андрэя Фомачкіна**, які вядомы тым, што на цырымоніі адкрыцця Паралімпіяды-2016 у Бразіліі пранёс сцяг Расіі, парушыўшы забарону Міжнароднага алімпійскага камітэта. Пасля гэтага слава знайшла свайго героя. Беларускаму чыноўніку Фомачкіну падарылі кватэру ў Падмаскоўі, ён стаў ганаровым жыхаром расійскага горада Зеленаградска ў Калінінградскай вобласці, а ў Новасібірскай вобласці нават прапаноўвалі назваць новы стадыён яго імем. У Беларусі, дарэчы, Фомачкін таксама не застаўся без увагі – быЛы загадчык аддзела зімніх відаў спорту ва ўпраўленні нацыянальных каманд Міністэрства спорту стаў дырэктарам спарткомплексу “Раўбічы”.

Зараз Фомачкін ужо, відаць, дасягнуў таго ўзроўню, што можа адпраўляць хакеістаў “на фронт” і на ўласным прыкладзе паказваць моладзі, што такое сапраўдны патрыятызм.

Дарэчы, пасля гэтага беларуская “маладзёжка” правяла тры таварыскія сустрэчы. Калі ў першай гульні беларусы выйгралі ў каманды “Бафала” (5:0), то затым саступілі зборнай Славакіі (1:4) і літаральна зганьбіліся ў матчы з камандай ЗША – 0:14. Вось вам і патрыятызм! Зрэшты, будзем лічыць, што галоўныя бітвы яшчэ наперадзе…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. *Учора позна ўвечары зборная Беларусі правяла на чэмпіянаце свету першы матч з камандай Швецыі, але графік выхаду газеты не дазваляе паведаміць вынік сустрэчы. Сачыце за навінамі на сайце: nv-online.info.*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Дар’я БЛАШКО:

«Не бачыла святла ў канцы тунэля»

Наваполацкая біятланістка распавяла, чаму вырашыла выступаць за зборную Украіны.

Дар’я Блашко пакуль не мае права выступаць за ўкраінскую каманду на міжнародных спаборніцтвах, але днямі на чэмпіянаце Украіны па біятлоне беларуска перамагла ў спрынтарскай гонцы. Дарэчы, чацвёртае месца заняла яшчэ адна экс-прадстаўніца зборнай Беларусі **Марыя Панфілава**.



“Два апошнія гады поўнасцю аддавалася рабоце, траціла ўсе зробленыя грошы на падрыхтоўку і спадзявалася на разуменне з боку Беларускай федэрацыі біятлона, – распавяла Дар’я tut.by пра прычыны сваёй “эміграцыі”. – *Але ў нейкі момант мы з маім трэнерам Уладзімірам Анатольевічам Махлаевым аказаліся ў вялікіх даўгах і перад выбарам: альбо я павінна рыхтавацца ў рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі “Раўбічы”, альбо шукаць іншыя варыянты. Федэрацыя фінансавала маю падрыхтоўку, але атрыманне фінансавання было праблематычным. Пасля змены кіраўніцтва ў федэрацыі нам паўсюль уключалі чырвонае святло. Так адбылося з-за адмовы трэніравацца ў камандзе “Раўбічы”.*

Паводле слоў спартсменкі, дадому вяртацца яна не збіраецца.

“Нават не дапускаю варыянт, што калі-небудзь яшчэ буду выступаць за зборную Беларусі, – кажа яна. – *Якія б умовы ні прапаноўвалі. Пасля двух гадоў працы з Беларускай федэрацыяй біятлона ўжо складана паверыць у цуд. Не бачыла я там святла ў канцы тунэля…”*

Сяргей НІКАНОРАЎ.

ШАШКІ

Падведзены вынікі

Закончыўся 19-ы чэмпіянат Беларусі па складанні шашачных кампазіцый. Знаёмім з яго вынікамі.

Катэгорыя “праблемы-64”: 1.**Пётр Шклудаў** (Наваполацк); 2.**Мікалай Ляшкевіч** (Мінск); 3.**Аляксандр Перавознікаў** (Рагачоў).

Катэгорыя “мініяцюры-64”: 1.**Пётр Шклудаў**; 2.**Аляксандр Кагоцька** (Бабруйск); 3.**Мікалай Ляшкевіч**.

Катэгорыя “эцюды-64”: 1.**Пётр Шклудаў**; 2.**Віктар Шульга** (Мінск); 3.**Дзмітрый Камчыцкі** (Магілёў).

Катэгорыя “задачы-64”: 1.**Аляксандр Шурпін** (Івянец); 2.**Мікалай Зайцаў** (Баранавічы); 3.**Мікалай Вяргейчык** (Гомель).

Катэгорыя “дамачныя праблемы-64”: 1.**Пётр Шклудаў**; 2.**Віталь Варушыла** (Мінск); 3.**Дзмітрый Камчыцкі**.

Катэгорыя “бразільскія шашкі”: 1.**Дзмітрый Камчыцкі**; 2.**Віталь Варушыла**; 3.**Пётр Шклудаў**.

Прыемна адзначыць, што сярод прызёраў многа нашых пастаянных аўтараў. Асабліва выдзелім упэўненую перамогу найактыўнага аўтара і рашальніка нашай рубрыкі **Аляксандра Шурпіна** з Івянца ў катэгорыі “задачы”. Віншуем і **Аляксандра Перавознікава** з Рагачова. Гэта яго першае прызавое месца ў чэмпіянатах Беларусі. Ніжэй прыводзім задачу **Аляксандра Шурпіна** з чэмпіянату. За ўсю гісторыю шашачнай кампазіцыі гэта толькі трэцяя задача з замыканнем чорнай шашкі на весавым полі **g7** у галоўным варыянце.

№1 **Белыя**: дамкі a1, c1, f2, f8, g1, шашкі b4, b6, g3, g5, h6 (10).

Чорныя: дамка h2, шашкі a3, c5, d2, d4, d6, e3, e5, f4, g7 (10).

f6, c5, c5, b6(a7:c5**A**), g5, a7, d4, e5 – (**g7**). **A**(a3:c5), bg5, ge3, f8, d2, a5, b4, ab2 – (**a3**).

Пасля перапынку

2 снежня гэтага года пасля працяглага перапынку быў праведзены вочны рэспубліканскі конкурс па рашэнні шашачных кампазіцый, які праходзіў у дзіцяча-юнацкай школе па шахматах і шашках №11. Было прапанавана рашыць за 1 гадзіну 10 заданняў. Упэўненую перамогу атрымаў міжнародны гросмайстар **Ігар Міхальчанка** з Ваўкавыска. Другім стаў **Аляксандр Маркін** з Гродна. Трэці – **Віталь Варушыла**. Высокі вынік сярод дарослых рашальнікаў паказалі **Леў Марат** са Слоніма і **Арцём Ціханаў** з Ваўкавыска. Абодвум былі ўручаны дыпломы за перамогу ў юнацкім заліку.

Новыя кампазіцыі

Іван Івацка з украінскага горада Вінніца прапануе кампазіцыі ў рускія і міжнародныя шашкі.

№2 **Белыя**: 25, 26, 32, 34, 35, 39, 40, 42, 46, 48, 50 (11).

Чорныя: 7, 8, 13, 14, 15, 17, 19, 23, 24, 28, 36, 45 (12).

38, 42, 41, 21, 1, 22(6), 2, 20, 39, 39 x.

№3 **Белыя**: 6, 17, 18, 23, 36, 42 (6).

Чорныя: 9, 11, 20, 27, 30, 32, 40 (7).

13, 31, 1, 35, 37, 24(37), 47 x.

№4 **Белыя**: a7, b4, b6, c7, d6, e5, f6, g5 (8).

Чорныя: a5, b2, c3, d2, d8, e3, f2, h4, h8 (9).

fe7, ab8, d8, e1, g7, a3 x.

№5 **Белыя**: a1, b6, c1, c7, f2, f6, g1, g5 (8).

Чорныя: a3, a5, b4, d2, d4, e3, g3, h4, h6, h8 (10).

d8(e1), de7, d8, g3, ab2 x.

Сталічны кампазітар **Іван Наўроцкі** працягвае здзіўляць плёнам сваёй творчасці – кампазіцыямі з нулявым фіналам у міжнародныя шашкі.

№6 **Белыя**: 13, 18, 19, 23, 33, 39, 48 (7).

Чорныя: 7, 24, 27, 30, 37, 40, 41 (7).

42, 28, 8, 2(18**A**), 47 x **A**(12), 46 x.

№7 **Белыя**: 11, 19, 20, 21, 24, 27, 31 (7).

Чорныя: 6, 8, 9, 12, 18, 28, 32, 38 (8).

20-14, 3, 13, 35 x.

№8 **Белыя**: 23, 27, 28, 33, 34, 35, 37, 43 (8).

Чорныя: 7, 8, 10, 13, 14, 17, 24, 25 (8).

24-29(20), 28-22, 22, 3, 30, 5 x.

№9 **Белыя**: 16, 18, 19, 32, 38, 39, 46, 49 (8).

Чорныя: 9, 10, 20, 21, 27, 30, 31, 36, 40 (9).

44, 41, 34, 3, 27, 27 x.

Наступную праблему прапануем рашыць самастойна.

№10 **Белыя**: 16, 18, 22, 23, 25, 28, 29, 32 (8).

Чорныя: 7, 8, 11, 14, 15, 19, 31, 39 (8).

На заканчэнне прапануем дамачную праблему-100 **Рыгора Краўцова** (в.Рублёўск Круглянскага раёна).

№11 **Белыя**: дамка 48, шашкі 7, 11, 20 (4).

Чорныя: дамкі 10, 18, шашкі 9, 15, 16, 19, 40 (7).

1(24**A**), 13(8), 30, 11, 50 x **A**(7), 5, 23(45**BC**), 40, 4 x **B**(44), 40, 34(30**D**), 3, 17, 50 x **D**(29), 4, 22, 50 x **C**(30, 44/45), 40 x.

Супаставім рашэнні

“Народная Воля” ад 8 лістапада 2017 года.

№1 – d8(a3), g5, e7, c1 x.

№2 – b6, b8, f4, c1(f4), g5, f2 x.

№3 – d6, d8, a5, c1 x.

№4 – ef6(g:e5), b8(h2), f8, ad6 x.

№5 – b8, h8,(f6), h:e1, c3(f2), g3, e1 x.

№6 – d8, dc7, d8, b6, fg5, e7 x.

№7 – cb8, f8(b6), c5, b6, f6-e7(d:d4**A**), fh6, g7, b8 x **A**(h:d4), h6(g5), g1, c1 x.

№8 – b8, f8,(a5), b6, c7, a1, f4, f6 x.

Дакладныя адказы даслалі: **Аляксандра Камінская** (Вілейка), **Юрый Голікаў** (Цвер, Расія), **Эдуард Дамброўскі, Віталь Варушыла**, **Іван Наўроцкі** (Мінск), **Ігар Ананіч** (Гродна), **Мікалай Зайцаў** (Баранавічы), **Уладзімір Валчкоў** (Маладзечна), **Леанід Жыхар, Фёдар Карпей** (Мядзел), **Аляксандр Шурпін** (Івянец), **Уладзімір Бандарык** (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), **Рыгор Краўцоў** (в.Рублёўск Круглянскага раёна), **Уладзімір Панько** (Камянец).

Дзякуем за лісты і спадзяёмся на вашу далейшую актыўнасць.

Пераможца бліц-конкурсу – **Эдуард Дамброўскі** (Мінск). Спецыяльны прыз атрымае група рашальнікаў ДУА “Брэсцкая санаторная школа-інтэрнат”. Было прыемна атрымаць іх калектыўны ліст. На жаль, у ім не пазначаны прозвішчы рашальнікаў.

Свае лісты дасылайце на адрас: **220030 г.Мінск, вул.Энгельса, 34а, “Шашкі”** або на электронны адрас рэдакцыі: **shulga.checkers@gmail.com**

Віктар ШУЛЬГА, міжнародны майстар спорту па шашачнай кампазіцыі.



СОВЕРШЕНСТВУЕМ ЗНАНИЯ

Зима – не помеха

У меня не было времени осенью внести в почву доломитовую муку. Можно ли это сделать зимой? Земля-то у меня кислая…

Артур ОНИХОВИЧ.

г.Ивацевичи.

При зимних сроках внесения известковых удобрений их эффективность не снижается, но при этом необходимо соблюдать определенные условия. Прежде всего, во избежание смыва известковых удобрений при таянии снега вносить их следует на ровных участках с уклоном не более 3 градусов при глубине снежного покрова 30 см и более.

Вносить пылевидные известковые удобрения на замерзшие, но не покрытые снегом участки, нецелесообразно. Следует также помнить, что дозы извести при зимнем известковании нужно увеличивать на 20 процентов.

РАСТЕНИЯ ЛЕЧАТ

Тимьян

Трава тимьяна (чабрец) содержит эфирное масло, дубильные вещества, органические кислоты, флавоноиды.

Тимьян применяют как закрепляющее лекарство при желудочно-кишечных заболеваниях и как отхаркивающее средство.

В Армении спиртовую настойку из травы чабреца пьют при заболеваниях сердца, печени, при поносах и как противовоспалительное средство.

В Австрии траву чабреца используют в качестве противосудорожного лекарства.

В Болгарии – при бронхиальной астме и язвенной болезни.

Во Франции нашли еще одно применение траве – ее используют при ожогах кислотами.

В Беларуси отвары тимьяна пьют при простудных заболеваниях, кашле, язве, болях в желудке при пониженной кислотности, при нервных расстройствах, бессоннице, ревматизме.

При радикулите, ревматизме, отложениях солей полезны ванны из тимьяна.



НАША ПЕРЕПИСКА

Какую пленку покупать?

Михаилу Рыбкину, Дрибинский район. Светопрозрачность армированной пленки на 10–12 процентов ниже, чем у стабилизированной неармированной. Она более прочная, лучше удерживает тепло и может служить два года. Однако на второй год прозрачность у нее значительно снижается.

Борису Выгонцову, г.Слуцк. Аммиачную селитру нельзя смешивать с порошковидным суперфосфатом, золой, известковой и доломитовой мукой, навозом и пометом птиц.

Анне Дыленко, г.Житковичи. Острый перец выращивают в качестве пряности для приготовления пищи, а также как лекарственное растение. Некоторые дачники разводят его и как декоративную культуру.

Елене Звонковой, Минский район. Самый безопасный, экологически чистый препарат от сорняков – «Раундап». Обрабатывают им грядки за 10 дней до посева или посадки овощей. Он уничтожает злейшие сорняки – осот, пырей, вьюнок, мокрицу и другие.

Ярославу Давыденко, г.Поставы. Грушам нужна очень низкая температура хранения: от -1…-0,5°С до 0…+5°С градусов. При повышенных температурах они хранятся всего несколько недель, а при нулевой температуре – несколько месяцев. Например, Любимица Клаппа хранится до декабря, Бера – до марта.

Наталье Дрозд, Гродно. Получение выгоночной зелени в комнатных условиях возможно в темное время года – с ноября по февраль. Температура должна быть +15…+25°С. Полив умеренный. Почва любая, но желательно песок, торф.

ДЕЛИМСЯ ОПЫТОМ

Преграда для слизней

В этом году на грядках было очень много слизней. Как я с ними боролся? В этой борьбе мне помогал обычный сухой торф. Летом вредители большого вреда не причиняли, но к началу осени они подросли и стали питаться редисом, сладким перцем и другими овощами. Где-то я читал, что сухой торф для слизней является непреодолимым препятствием даже в самую дождливую и холодную ночь. Это более эффективное средство, чем негашеная известь. Сделал дорожки из торфа возле овощных культур, и нападение на них прекратилось. Замечу, дорожки должны быть сплошными, без пропусков.

Даниил ВАСЮКОВИЧ, г.Климовичи.

Свои семена

В конце сентября семенники лука-порея срезаю и держу в сухом месте около месяца, до полного созревания. Затем кладу семенники в плотный холщовый мешочек и колочу по нему палкой – обмолачиваю. После этого содержимое мешка высыпаю в кастрюлю, заливаю холодной водой и размешиваю. Всплывшую полову и незрелые семена сливаю. Оставшиеся на дне откидываю на сито и раскладываю сушить на полотенце. Полученных семян хватает на 3–4 года, у них хорошая всхожесть. Делюсь семенами и с соседями.

Наталья КОЗЫРЕВА, Минск.

ОГОРЧАЕМСЯ НЕУДАЧЕЙ

Яблоки гниют…

Заложил я на хранение яблоки разных сортов. Смотрю, на некоторых из них начали появляться различные гнили. Откуда эта напасть и что теперь делать? Я даже не знаю и названий этих болезней…

Сергей КОЛЯКИН.

Узденский район.

Всем садоводам известна **плодовая (или монилиальная) гниль.** Если заражение происходит и развивается, то на гниющей поверхности плода появляются подушечки серого цвета – спороношение. Потом с такого плода, который находится на дереве, споры разлетаются во все стороны и заражают другие яблоки. Часть пораженных плодов может долго висеть на дереве. А весной споры с них рассеиваются.

В хранилище гриб тот же, а гниль с виду совсем другая: поверхность сгнившего плода черная, блестящая. Никаких подушечек и спор не образуется. Поэтому гниль черная.

Совсем по-другому выглядит **горькая плодовая (или глеоспоризная) гниль.** На плоде сначала появляются круглые пятна коричневого цвета. Потому они как бы расслаиваются на темные и светлые. Мякоть плода горькая. Особенно быстро гниют плоды в тепле, при +2°С. Причина появления болезни – небрежная обрезка дерева, плохая защита ран: на них поселяется гриб и перебирается на плоды.

Если быстро растет светло-бурое, чуть желтоватое пятно – значит, на плодах появилась **сизая плесневидная гниль.** Позже на них образуется зеленовато-сизый налет. Запах от плодов затхлый.

Бывает и **розовая плесневидная гниль.** В месте приникновения инфекции появляется небольшое гниющее бурое пятно. Потом на нем образуется розовый налет. Вкус плода резкий, кислый, горький. Стимулирует развитие болезни высокая температура.

В хранилище плоды часто заболевают **серой гнилью.** Тут нужен глаз да глаз: болезнь быстро переходит на соседние плоды. Недаром ей дали другое название – очаговая гниль.

Еще одна опасная болезнь – **фузариозная гниль.** Заметить ее трудно: на поверхности плода все в норме, а если его разрежете, то внутри обнаружите гниль. Если яблоко полежит долго, то и вся мякоть до самой кожицы сгниет.

Что делать? Заболевшие плоды отбирайте и выкидывайте. Но самое главное – определите, что у вас в саду неладно, где вы недорабатываете. Чьи следы заметите в хранилище, возьмите их на карандаш. Зимой покопайтесь в литературе и наметьте план защиты растений.

Раздел ведет агроном Федор ВЕРАВОЙША.


МЧС ПРЕДУПРЕЖДАЕТ…



Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ



Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 26.12.2017 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23 630 экз. Заказ № 4637.